УДК 91(075.8)
ББК 26.8я73
С836

Друкуецца па рашэнні рэдакцыйна-выдавецкага савета
БДПУ імя М.Танка

*Рэцэнзенты:* кафедра геаграфіі Гомельскага дзяржаўнага універсітэта імя Ф. Скарыны; *А. М. Баско*, кандыдат геаграфічных навук, дацэнт кафедры фізічнай геаграфіі БДПУ імя М. Танка

**Страха М. Л.**
С836 Комплексная палявая практыка па геаграфіі: Вучэб.-метад. дапам. — Мн.: БДПУ імя М. Танка, 2001. — 27с.

Дапаможнік змяшчае праграму комплекснай палявой практыкі па геаграфіі, а таксама шэраг метадычных матэрыялаў у дапамогу кіраўнікам практыкі і студэнтам стацыянарнай і завочнай форм навучання.

Рэкамендуецца выкладчыкам і студэнтам геаграфічных спецыяльнасцяў педагагічных вышэйшых навучальных устаноў. Можа быць выкарыстаны для арганізацыі краязнаўчай работы настаўнікамі геаграфіі сярэдніх навучальных устаноў.

2018

**ББК 26.8я73**

© М. Л. Страха, 2001

Репозиторий БГПУ

## ТЛУМАЧАЛЬН АЯ ЗАПІСКА

У сістэме падрыхтоўкі настаўнікаў геаграфіі значнае месца адводзіцца палявым практыкам. У працэсе комплекснай палявой практыкі па геаграфіі, якая праводзіцца ў восьмым семестры ў аб'ёме 108 гадзін, студэнты абагульняюць навыкі па правядзенні палявых даследаванняў, набытыя ў час палявых практык па розных дысцыплінах, бліжэй знаёмяцца з некаторымі геаграфічнымі з'явамі і працэсамі, а таксама авалодваюць практычнымі навыкамі і ўменнямі правядзення комплексных геаграфічных даследаванняў асобных тэрыторый і аб'ектаў. Студэнты за час практыкі атрымліваюць магчымасць паглыбіць тэарэтычныя веды, узбагаціць агульны светапогляд.

Метадычным дакументам, на падставе якога да апошняга часу праводзілася комплексная палявая практыка па геаграфіі, з'яўлялася праграма, зацверджаная яшчэ ў 1985 г. У ёй дадзеная практыка разглядалася як дальняя, паколькі яна прадугледжвала вывучэнне тэрытарыяльна-вытворчых комплексаў, якія склаліся ў аддаленых ад месца пражывання і навучання студэнтаў рэгіёнах былога СССР. Галоўнымі крытэрыямі пры выбары той ці іншай тэрыторыі ў якасці раёна практыкі былі наступныя: валоданне развітым комплексам асноўных галін гаспадаркі, спалучэнне дастаткова кантрастных прыродна-тэрытарыяльных комплексаў і галін гаспадарчай дзейнасці, наяўнасць розных тыпаў населеных пунктаў. Фактычна комплексная практыка з'яўлялася працягам вучэбных курсаў "Сацыяльна-эканамічная геаграфія СССР" і "Фізічная геаграфія СССР".

Пасля распаду СССР і набыцця Рэспублікай Беларусь дзяржаўнага суверэнітэту, па прычыне трансфармацыі былой адзінай гаспадаркі і стварэння новай сістэмы эканамічных адносін паміж незалежнымі дзяржавамі, а таксама ў сувязі з кардынальнымі зменамі, што адбыліся ў сацыяльна-палітычным жыцці нашага грамадства, наспела пільная неабходнасць удакладніць мэты і задачы комплекснай палявой практыкі па геаграфіі, перагледзець яе змест і канцэпцыю вызначэння раёна правядзення.

З улікам патрабаванняў новых вучэбных планаў падрыхтоўкі настаўнікаў па геаграфічных спецыяльнасцях, у якасці асноўнага раёна правядзення комплекснай палявой практыкі па геаграфіі сёння вызначаецца тэрыторыя Рэспублікі Беларусь. Аднак студэнты не пазбаўлены магчымасці пазнаёміцца і з нехарактэрнымі для Беларусі прыроднымі і сацыяльна-гаспадарчымі комплексамі: новай праграмай практыкі прапануюцца таксама варыянты яе правядзення на тэрыторыі Польшчы, Украіны, Расіі ды іншых краін.

У сучасных умовах сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь найбольш аптымальным варыянтам пры выбары раёна правядзення комплекснай палявой практыкі па геаграфіі з'яўляюцца сумежныя тэрыторыі Беларусі і суседніх дзяржаў: Поўнач Беларусі (Віцебск – Полацк – Наваполацк) – Паўночны Захад Расіі (Пскоў – Санкт-Пецярбург); Паўночна-Заходняя